*УДК 61:615.1(062)(476-25)*
*ББК 52я73*
*А 43*
*ISBN 978-985-21-1258-1*


***Гусачэнка Д.У., Русан Д.Ю.***

# ПЫТАННІ АДАПТАЦЫІ ЗАМЕЖНЫХ СТУДЭНТАЎ У КРАІНЕ ВЫВУЧАЕМАЙ МОВЫ

***Навуковы кіраўнік: ст. выкл. Носік А.А.***
*Кафедра беларускай і рускай моў*
*Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт, г. Мінск*

**Актуальнасць.** Актуальнасць дадзенай працы абумоўлена цікавасцю да працэсу адаптацыі замежных навучэнцаў да ўмоў жыцця і навучання ў БДМУ.

**Мэта:** выявіць цяжкасці ў працэсе навучання ў нашай краіне як замежнай; прасачыць за дынамікай змяненняў псіхалагічнага стану замежных студэнтаў.

**Матэрыялы і метады.** Праведзены статыстычны аналіз і апытанне студэнтаў медыцынскага факультэта замежных навучэнцаў; апрацавана сабраная інфармацыя з наступным падагульненнем вынікаў.

У ходзе даследавання была выяўлена цесная сувязь сацыяльна-псіхалагічных праблем з этналінгвістычнымі асаблівасцямі паддоследных. Для ажыццяўлення мэты выкарыстоўваўся метад анкетавання замежных студэнтаў-прадстаўнікоў розных рэгіёнаў на розных этапах працэсу адаптацыі ў трох яе аспектах: бытавым, акадэмічным, сацыякультурным. У выніку аналізу атрыманых дадзеных былі вылучаны падабенствы і адрозненні падчас праходжання адаптацыі ў прадстаўнікоў розных рэгіёнаў, а таксама вызначаны асноўныя фактары, якія ўплываюць на працягласць і паспяховасць адаптацыйнага працэсу: ступень блізкасці роднай культуры да беларускай, яе адкрыты / закрыты характар; камунікабельнасць канкрэтнага этнатыпу; прыярытэт духоўнага / матэрыяльнага ў нацыянальным менталітэце; тыпалагічныя асаблівасці роднай мовы / мовы-пасрэдніка; ступень матываванасці да вучобы; цікавасць да культуры і традыцый краіны пражывання (Беларусі) і інш.

**Вынікі.** Праведзенае даследаванне можа служыць падмуркам для пабудовы цэласнай навуковай канцэпцыі па пытаннях адаптацыі ва ўмовах няроднаснага культурнага і моўнага асяроддзя. Яго вынікі могуць знайсці практычнае прымяненне пры распрацоўцы канкрэтных метадычных рэкамендацый для спецыялістаў, чыя прафесійная дзейнасць прадугледжвае зносіны з замежнымі студэнтамі-прадстаўнікамі розных этнасаў, носьбітамі розных моў і культур.